**В номере:**

Чей каравай лучше с. 2



Заплатить заставят с. 11



Сейчас вылетит птичка с. 8



Раённая масавая газета. Заснавана 24 сакавіка 1935 года

# ДОБРУШСКІ КРАЙ

№80 (10998)

17 кастрычніка 2020 года
Субота

**РЭХА ПАДЗЕІ**



# Шчасце дарыць жыццё

**Урачыстае мерапрыемства, прысвечанае Дню маці, прайшло ў мінулую сераду ў Гомельскім абласным грамадска-культурным цэнтры**

Жыхарак Гомельшчыны, якія выхавалі пяць і больш дзяцей, са святам павіншаваў старшыня аблвыканкама Генадзь Салавей. Разам з памочнікам Прэзідэнта-інспектарам па Гомельскай вобласці Юрыем Шулейкам ён уручыў 22 жанчынам узнагароды – ордэн Маці.

Насаўлянка Валянціна Брылёва, якая таксама была ўдзельніцай мерапрыемства, на сцэну не ўзнімалася, бо ордэн ёй уручылі яшчэ летам. Аднак само запрашэнне на свята такога ўзроўню яна лічыць адным з лепшых падарункаў.

– Прыемна было чуць словы ўдзячнасці ад кіраўніка рэгіёна, атрымліваць музычныя падарункі ад лепшых артыстаў вобласці і ведаць, што ўсё гэта – для нас, – падзялілася яна ўражаннямі з журналістамі "ДК". – Генадзь Салавей расказаў, якую падтрымку аказвае дзяржава прыёмным і шматдзетным сем'ям. І сапраўды, для нас робіцца нямала. Льготы і дапамога, у тым ліку і фінансавая, – немалаважныя рэчы не толькі для шматдзетных бацькоў. Нам, напрыклад, дапамаглі сабраць дзяцей у школу. І за гэта – вялікі дзякуй!

Валянціна Брылёва – чалавек сціплы. Свой ордэн яна не апранае. Выключэнне зрабіла толькі для газетчыкаў. Кажа: не дзеля ўзнагарод нарадзіла шасцярых дзяцей.

– З мужам Раманам заўсёды марылі аб вялікай дружнай сям'і. І Бог даў нам гэтае шчасце, – кажа шматдзетная маці.

Нагадаем: на Гомельшчыне 1792 жанчыны ўзнагароджаны ордэнам Маці, 62 з іх – у гэтым годзе. На Добрушчыне ж узнагароду за час самастойнай Беларусі атрымалі 32 жанчыны.

**Сяргей ВОЛЬГІН**
**Фота Яўгена УСЦІНАВА**

## Весткі з месцаў

### Батарэі пацяплелі

**16 кастрычніка пачалася падача цяпла ў жылфонд раёна. Згодна з нарматывамі, на неабходныя пусканаладачныя работы адводзіцца пяць дзён, паведамілі ў «Добрушскім камунальніку».**

У будынкі сацыяльнай галіны падача цяпла пачалася крыху раней. Адпаведнае распараджэнне райвыканкама падпісана яшчэ 14 кастрычніка. Батарэі спачатку пацяплелі ў дзіцячых садках, школах, установах аховы здароўя і некаторых іншых аб'ектах сацкультбыту.

Пакуль тэмпература паветра будзе трымацца днём вышэй за +10 градусаў і ў выхадныя дні ацяпленне гэтых памяшканняў будзе праводзіца ў рэжыме прапальвання.

**Наталля ХАДУНЬКОВА**

### Горад у мініяцюры

**Ураённым цэнтры дадатковай адукацыі завяршылі работу над праектам, прысвечаным малой радзіме. Тут вырабілі паменшаныя копіі гарадскіх славутасцей.**

– У нас была творчая задача: здзівіць крэатывам. Больш канкрэтныя абрысы яна набыла напярэдадні 460-годдзя Добруша. У нашым горадзе нямала месцаў, вартых багатай экскурсійнай праграмы. Мы і вырабілі іх паменшаныя копіі, – расказала педагог дадатковай адукацыі Ірына Гушчына.

Разам з выхаванцамі аб'яднання па інтарэсах "Экаартдызайн" педагог стварыла макеты стэлы "Добруш", мемарыяльнага комплексу "Памяць", помнікаў архітэктуры – так званых "вежу" папяровай фабрыкі, "гарбаты мост", фасад раённага краязнаўчага музея. Усе макеты выкананы з фатаграфічнай дакладнасцю і распісаны ўручную.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**

ISSN 2073-1000

**погода**

Долгота дня 10.26
Луна
17, 18 октября – в Скорпионе,
19, 20, 21 – в Стрельце



Первая четверть
24 октября

**18 октября**
НОЧЬЮ +3…+5
ДНЕМ +5…+7
Сплошная облачность.
Небольшой дождь.
Ветер ю.-западный 6-8 м/с.

**19 октября**
НОЧЬЮ +4…+6
ДНЕМ +6…+8
Переменная облачность.
Возможен дождь.
Ветер западный 6-8 м/с.

ВЕДАЙ НАШЫХ!

# На п'едэстале – майстэрства

Каравай Добрушскага раёна прызнаны самым прыгожым па выніках абласнога конкурсу «Лепшы каравай».



Дыплом першай ступені днямі быў уручаны старшыні райкама прафсаюза работнікаў аграпрамысловага комплексу Сяргею Прыходзьку на пашыраным прэзідыуме абкама.

Выстава экспанатаў конкурсу стала адной з самых яркіх частак абласнога фестывалю працаўнікоў вёскі "Дажынкі-2020" у Мазыры. Майстры-хлебапёкі з раёнаў Гомельшчыны прадэманстравалі свае ўменні ў выпечцы караваяў і іх упрыгожванні. Аздобленыя дэкаратыўнымі элементамі з саломы і пластыку, кветкамі з зефіру, рознакаляровай масцікі... Выраб, які прадставілі дабрушане, вылучаўся самабытнасцю. Гэта адзначыла і журы конкурсу. Трох'ярусная ажурная канструкцыя, якая складалася з аднаго вялікага і некалькіх малых караваяў, сабраных у адну хлебную кампазіцыю, выканана ў класічным стылі.

Як стала вядома "ДК", перамогу раёну ў конкурсе прынесла кандытар Добрушскага хлебазавода Вольга Шкіцерава. На прадпрыемстве падкрэслілі: такі майстар – адна на ўвесь раён. Працэс прыгатавання – ад задумкі да ўвасаблення – яе творчая заслуга. Усяго два дні спатрэбілася, каб стварыць сапраўдны шэдэўр хлебнага майстэрства.

Конкурсным экспанатам распарадзіліся па традыцыі. Як некалі гаспадар дзяліў бохан з мукі новага ўраджаю паміж жнейкамі, так і ва ўпраўленні сельскай гаспадаркі і харчавання каравай падзялілі паміж гаспадаркамі раёна, што дабіліся значных поспехаў у вырошчванні і ўборцы зерневых. Так у раёне падкрэслілі ўклад аграрыяў у дасягненне высокіх вынікаў жніва-2020. Нагадаем, раён сёлета заняў другое месца ў вобласці па вытворчасці зерня.

**Наталля ВАСІЛЬЕВА**
**Фота аўтара**




НОВОСТИ РЕГИОНА

## «Гомсельмаш» отметил 90-летие

**Поздравляя многотысячный коллектив предприятия, помощник Президента – инспектор по Гомельской области Юрий Шулейко отметил, что «Гомсельмаш» по праву называют флагманом машиностроения, он достойно представляет Беларусь на мировом рынке сельхозтехники.**

«Сегодня на предприятии почти 7 тысяч работающих. Есть среди них династии, которые годами создавали имя заводу, его славную, богатую историю», – сказал Юрий Шулейко.

Слова признательности и наилучших пожеланий адресовал заводчанам председатель Гомельского облисполкома Геннадий Соловей. Он выразил уверенность, что впереди у предприятия новые разработки, новые машины, новые успехи.

По словам генерального директора ОАО Александра Новикова, сегодня «Гомсельмаш» выпускает 75 основных моделей самоходных комбайнов, более 70 адаптеров для уборки различных культур. «Вся техника, выпускаемая на предприятии, – это труд многих поколений», – подчеркнул он.

**По материалам СМИ**

ТЕМА НЕДЕЛИ

# Белорусы сами разберутся в ситуации

**Главная причина нынешних внутриполитических событий в Беларуси – влияние извне. Об этом Президент Беларуси Александр Лукашенко заявил на встрече с генеральным секретарем ОДКБ Станиславом Засем.**

«Непростой период мир переживает в целом. Это все до выборов прогнозировалось. Многие говорят, что Президент получал информацию, анализировал, знал об этом. Нет, не было никакой информации, что будет после этих выборов у нас, в мире вообще. Но прогноз мой оказался на 100 процентов точным – и по пандемии, и по ситуации, которая сегодня складывается. Несложно было все это спрогнозировать. К сожалению, наши западные, как принято говорить, партнеры, уж слишком активизировавшись, переборщили в отношении Беларуси», – отметил Александр Лукашенко.

По его словам, в Беларуси «особо не напрягаются в этом плане, хотя приятного тут мало». «Тихая, спокойная страна, а в Минске мы никак не можем голову взять в руки и подумать, как жить дальше. Но, я думаю, мы с этим обязательно справимся. В этом нет никаких сомнений, – заявил Президент. – Внутренняя ситуация не просто осложнена, а ее главная причина – внешняя. Не было бы внешнего давления и влияния, никогда бы этого в Беларуси не было. Хотя мы уже переживали всякое. Но тогда влияние извне было минимальным, а сейчас они закусили удила прилично. Но справимся. Белорусы – люди умные, разберутся в этом плане».

**По материалам БелТА**

# ОДКБ необходимо развивать



**Президент Беларуси Александр Лукашенко считает Организацию Договора о коллективной безопасности важной структурой, которую необходимо развивать. Об этом Глава государства заявил на встрече с генеральным секретарем ОДКБ Станиславом Засем.**

«События у нас в августе и реакция, прежде всего, России на эти события свидетельствуют о том, что эта организация очень важная и нам ее надо развивать. В разговоре с Путиным я как раз сказал об этом: теперь мы, наверное, поняли, что такое это ОДКБ и для чего нам эта организация нужна», – сказал Александр Лукашенко.

Ситуация в зоне ответственности ОДКБ сложная по нескольким факторам. Такую точку зрения выразил журналистам, отвечая на вопрос корреспондента БелТА, генеральный секретарь ОДКБ Станислав Зась по итогам встречи с Президентом Беларуси Александром Лукашенко.

Пандемия COVID-19 внесла коррективы в деятельность организации. Большинство запланированных мероприятий проводится в онлайн-режиме, а часть операций и учений перенесена на более поздний срок. Например, сдвинуты сроки проведения антинаркотической операции «Канал» и операции «Нелегал». Их хотят провести в 2021 году.

«Вторая особенность текущего года, она также сегодня обсуждалась, – это те события, та непростая ситуация, которая складывается в некоторых наших государствах. Это и Беларусь, и обострение конфликта в Нагорном Карабахе, и события в Кыргызстане. Ситуация, к сожалению, развивается везде очень сложно, – считает Станислав Зась.

НА СВЯЗИ

**19 октября с 10.00 до 12.00 по телефону 5-98-53**
пройдет прямая телефонная линия с участием
Александра Михайловича
БОРСЯКОВА,
начальника управления по труду, занятости и социальной защите райисполкома.

***

**20 октября с 12.00 до 14.00 по телефону 8 (0232) 92-11-91**
пройдет прямая телефонная линия с участием
Игоря Владимировича
ЗАВАЛЕЯ,
депутата Палаты представителей Национального собрания Республики Беларусь.